УДК 37

В. А. Кузьміч, заг. кафедры

# НАВУЧАННЕ ЯК ТВОРЧЫ ПРАЦЭС

This article tells about how to make creative power of teaching process more active. Experience of Belarusian language department of BSTU in students' creativeness developing is presented. Particular stress is made on practical aspect of the problem.

На сучасным этапе развіцця педагогікі творчы падыход да выкладання дысцыплін у вышэйшай школе з'яўляецца адной з галоўных задач ва ўсім навучальным працэсе ў цэлым. Цяперашнія складаныя і зменлівыя ўмовы грамадскага жыцця няспынна патрабуюць чагосьці новага, каб зацікавіць студэнтаў. Пастаянная канкурэнцыя ў сучасным свеце не дазваляе педагогу абмяжоўвацца толькі традыцыйнай, рэпрадуктыўнай тэхналогіяй навучання. Перадача ведаў – нялёгкая задача, але яшчэ цяжэй дапамагчы навучэнцам дасягнуць такой самастойнасці і адказнасці, выпрацаваць такую патрабавальнасць да іх творчага развіцця, каб яны духоўна ўзняліся над пабытавым узроўнем, адчулі сябе творчымі, актыўнымі і патрэбнымі ў грамадстве асобамі.

Што разумеецца пад паняццем творчасці? Паводле педагагічнай энцыклапедыі, творчасць – гэта найвышэйшая форма актыўнасці і самастойнай дзейнасці чалавека. Творчасць ацэньваецца па яго сацыяльнай значнасці і арыгінальнасці (навізне). Творчасць – гэта тое, што напаўняе вопыт чалавека новым зместам, якога не было раней, яна дапамагае ствараць новыя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці.

У якасці асноўных адзнак творчага мыслення студэнтаў і выкладчыкаў вылучаюць наступныя:

– атрыманне новых вынікаў;
– выкарыстанне новых тэхналогій;
– здольнасць самастойна ўбачыць і сфармуляваць праблему;
– устойлівая або кароткачасовая (моцная) матывацыя.

Ці ў дастатковай ступені студэнт-першакурснік падрыхтаваны да творчага пераасэнсавання сваёй ролі ў навучальным працэсе? На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што ў школьнай адукацыі недастаткова выкарыстоўваецца патэнцыял так званых праблемных метадаў, якія стымулююць самастойную і творчую пазнавальную дзейнасць вучняў. У выніку не ўсе навучэнцы першых курсаў ВНУ валодаюць навыкамі крэатыўнага мыслення, што адбіваецца на ўзроўні паспяховасці і істотна ўскладняе студэнтам далейшае прафесійнае развіццё.

Акрамя таго, сучасная педагогіка акцэнтуе ўвагу і на фактарах, якія перашкаджаюць творчасці. Сярод іх можна назваць галоўныя:

– недастаткова гнуткае мысленне;
– вузкапрактычны падыход;
– празмерная спецыялізацыя;
– уплыў аўтарытэтаў;
– боязь крытыкі і страх перад няўдачай;
– недастатковая адказнасць;
– нізкая ацэнка сваіх здольнасцей;
– адсутнасць заахвочванняў да творчай дзейнасці і належнага ўзнагароджання;
– нежаданне выконваць дадатковую працаёмкую работу.

Умовы, або фактары, якія ўплываюць на творчую дзейнасць, бываюць двух відаў: сітуацыйныя і асобасныя. Да першага адносяцца знешнія абставіны, у якіх адбываецца пазнавальная дзейнасць студэнтаў, да другога – устойлівыя асабістыя рысы і якасці студэнтаў.

Да сітуацыйных фактараў, якія адмоўна ўплываюць на творчыя магчымасці чалавека, адносяцца недахоп часу, стрэсавы стан, жаданне хутка знайсці рашэнне, занадта моцная ці слабая матывацыя, устаноўка на канкрэтны спосаб рашэння пэўнай задачы.

Да асобасных фактараў, якія негатыўна ўплываюць на працэс творчасці, адносяць канфармізм (згодніцтва), заніжаная ці завышаная самаацэнка, празмерная асцярожнасць.

Сярод асабістых рысаў, якія спрыяюць творчаму мысленню, вылучаюць упэўненасць у сваіх сілах, пазітыўны эмацыйны стан, нонканфармізм, пачуццё адказнасці і самапавагі.

Без уліку асобаснага фактару немагчыма наладзіць паўнацэнную творчую працу ў студэнцкім асяроддзі. Пры наладжванні творчай працы неабходна кіравацца некаторымі педагагічнымі парадамі і рэкамендацыямі. Папершае, ні ў якім разе нельга падаўляць ініцыятыву студэнтаў, яе трэба ўсяляк заахвочваць. Па-другое, выкладчык павінен спрыяць фарміраванню ў студэнта ўпэўненасці ў сваіх сілах. Па-трэцяе, неабходна стымуляваць імкненне студэнта да самастойнага выбару мэт, задач і сродкаў іх вырашэння. Чалавек, які не прызвычаіўся дзейнічаць самастойна, браць на сябе адказнасць за прынятыя рашэнні, траціць здольнасць да творчай дзейнасці. Важнейшая задача – не дапускаць канфармісцкага мыслення, змагацца са згодніцтвам і арыентацыяй на меркаванне большасці. Акрамя таго, рознымі сродкамі неабходна развіваць творчую фантазію студэнтаў. Так, напрыклад, конкурс на лепшую

казку сярод студэнтаў спецыяльнасці «Выдавецкая справа» знайшоў свой лагічны працяг у адным з дзіцячых садкоў горада Мінска. Студэнты прэзентавалі свае казкі ў дзіцячых групах, а затым знялі відэафільм па выніках наведвання дашкольнай установы. Падрыхтаваныя казкі знайшлі самы цёплы водгук у дзіцячай аўдыторыі (асабліва спадабалася дзецям, што іх любімыя казачныя героі былі добрымі і спагадлівымі).

Безумоўна, галоўная роль ў стымуляванні крэатыўнасці студэнтаў належыць выкладчыку, які адказвае за стварэнне спрыяльных ўмоў для развіцця творчай дзейнасці і сам з'яўляецца ўзорам творчай асобы. У аснове любой творчай працы знаходзіцца супрацоўніцтва паміж двума раўнапраўнымі суб'ектамі педагагічнага працэсу – выкладчыкам і студэнтам.

Варта звярнуць ўвагу на тое, што загрузка студэнтаў разнастайнымі відамі творчых прац яшчэ не ёсць творчая дзейнасць. Толькі тады яна будзе творчай, калі прывядзе да атрымання новага выніку, новага прадукту.

У пачатку арганізацыі творчай працы выкладчык аб'яўляе студэнтам, для чаго і з якой мэтай выконваецца гэта праца, што будзе яе вынікам. Так, напрыклад, праведзеныя кафедрай беларускай мовы выставы да 60-годдзя вызвалення Беларусі і да Рэспубліканскага Дня маці мелі на мэце актывізацыю творчай дзейнасці студэнтаў у цеснай сувязі з ідэалагічным і ідэйна-маральным выхаваннем. Студэнтам прапаноўвалася магчымасць праявіць сябе ў падрыхтоўцы разнастайных відаў творчых прац у залежнасці ад уласных схільнасцей, здольнасцей і інтарэсаў. Такі актыўны ўдзел студэнцкай моладзі у творчай працы стаў вынікам таго багатага выбару прапанаваных форм самарэалізацыі (напісанне радаводаў, творчых даследаванняў, сачыненняў, выпуск насценных газет, плакатаў, выраб твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прэзентацыя ўласных вершаў і інш.). Усяго на гэтых выставах экспанаваліся 534 творчыя працы. Менавіта права выбару, а не навязванне гатовых форм творчай працы паспрыяла таму, што студэнты самастойна распрацавалі і прэзентавалі шэраг іншых відаў працы, не запланаваных выкладчыкам. Зробленыя імі відэафільмы з наступным выкарыстаннем іх на практычных занятках, праведзеныя сустрэчы з ветэранамі вайны і працы як фрагмент заняткаў, канферэнцыі, валанцёрскія наведванні – усё гэта не толькі стварыла дадатковы матэрыял для далейшага выкарыстання ў навучальным працэсе, але і прынесла значны выхаваўчы плён.

Больш таго, некаторыя творчыя працы паслужылі пачаткам для далейшай рэалізацыі студэнтамі іх здольнасцей у навуцы. На сённяшні дзень з 17 навуковых прац, прадстаўленых на рэспубліканскія конкурсы, 9 атрымалі другую і трэцюю катэгорыі, а па выніках удзелу ў Рэспубліканскім конкурсе творчых прац атрыманы дыпломы першай і трэцяй ступеней (пад кіраўніцтвам заг. кафедры Кузьміч В. А. і канд. філ. навук Федарцовай Т. М.). Усяго за 2004 год на рэспубліканскія конкурсы навуковых прац прадстаўлена 28 работ. Гэта стала вынікам сумеснай з выкладчыкамі навуковай і творчай дзейнасці студэнтаў.

Важным крытэрыем творчага мыслення з'яўляецца наяўнасць ярка выражанага эмацыйнага перажывання падчас творчага працэсу. Нельга недаацэньваць ролі эмацыйнага перажывання, у прыватнасці пачуцця справядлівасці, гонару, патрыятызму ў падрыхтоўцы творчых даследаванняў. Менавіта для гэтых мэт наладжана праца гурткоў «Спадчына», «Выток», «Крыніца», «Памяць», «Пазнай свой край», «Мая Радзіма – Беларусь», «Міласэрнасць». Напярэдадні 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ўдзельнікам гуртка «Памяць» прапанавалася распрацоўка творчых даследаванняў па тэме «Вайна праз лёс маёй сям'і», радаводаў, нарысаў, сачыненняў, якія адлюстроўвалі змаганне нашага народа з фашызмам. Працы студэнтаў былі зроблены грунтоўна, з выкарыстаннем шырокіх гістарычных і архіўных матэрыялаў па тэме, відэазапісаў. Творчыя працы прэзентаваліся ў студэнцкіх групах, падчас сустрэч з ветэранамі вайны і працы. Дзейнасць гурткоў стварае спрыяльныя ўмовы для больш поўнага развіцця студэнтамі іх творчага патэнцыялу.

Вынікі навуковай творчай працы студэнтаў замацоўваюцца і падсумоўваюцца пры правядзенні навукова-практычных канфе-рэнцый. Толькі за першы семестр 2004–2005 года праведзена 6 навукова-практычных канферэнцый па наступнай тэматыцы: «Беларускія асветнікі», «Мая Радзіма – Беларусь», «Зямлі адзінай людзі», «Патрыёты Бацькаўшчыны», «Да 90-годдзя Аркадзя Куляшова» і інш., у якіх выступілі 90 студэнтаў. Асаблівасцю такіх канферэнцый з'яўляецца нестандартны падыход да арганізацыі мерапрыемства. Як правіла, на такія канферэнцыі запрашаюцца знакамітыя навукоўцы, дзеячы культуры, ветэраны, навучэнцы з іншых навучальных устаноў г. Мінска. Адпаведным чынам афармляецца і зала (выстава творчых і навуковых прац студэнтаў, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, літаратурныя газеты і інш.). Усё гэта стварае ўрачысты і святочны настрой і адпаведны эмацыйны стан. Дарэчы, і ў працэсе навучання выкладчыкі кафедры імкнуцца ў максімальнай ступені абапірацца на станоўчыя эмоцыі (здзіўленне, радасць, сімпатыя, адчуванне поспеху і г. д.). Адмоўныя эмоцыі

прыгнятаюць праяўленне творчага мыслення. Таму варта прытрымлівацца аднаго з галоўных прынцыпаў вы-хавання – апора на станоўчае.

Выкладчыцкая дзейнасць непарыўна звязана з творчасцю. Практычна на ўсіх занятках даводзіцца нешта змяняць і ў змесце вучэбнага матэрыялу, і ў методыцы навучання.

З мэтай актывізацыі творчых здольнасцей студэнтаў выкарыстоўваюцца нетрадыцыйныя формы заняткаў, такія, як бінарныя лекцыі, прафесійна арыентаваныя сустрэчы з запрашэннем спецыялістаў па будучай прафесіі. Варта згадаць бінарную лекцыю па тэме «Славутыя беларускія навукоўцы»» (адна з тэм вуснага маўлення), праведзеную ў зале вучонага савета БДТУ кандыдатам хімічных навук, дацэнтам Міляшкевічам Я. Г. для студэнтаў 1-га курса факультэта ВСіП (спец. «Выдавецкая справа»). Выключна добрае валоданне беларускай мовай, глыбокае веданне гісторыі беларускай навукі і яе персаналіяў, праблемны характар падачы матэрыялу – усё гэта паспрыяла творчаму пераасэнсаванню ролі беларускай навукі ў сусветным кантэксце.

З мэтай укаранення вынікаў даследчай дзейнасці студэнтаў у навучальны працэс выканаўцы навуковых прац прыцягваліся да ўключэння ўласных здабыткаў у лекцыйны матэрыял. Напрыклад, на лекцыю па тэме «Лексіка» была запрошана з дакладам студэнтка Габурэц А. Б., якая прадставіла вынікі сваёй навуковай працы, прысвечанай запазычанням у беларускай мове, што было станоўча ўспрынята студэнтамі.

Акрамя таго, актыўна выкарыстоўваюцца такія адмысловыя віды працы, як самастойна падрыхтаваныя студэнтамі творчыя заданні да практычных заняткаў па загадзя прапанаванай тэматыцы (складанне тэстаў, заданні пошукавага характару, трансфармацыйныя практыкаванні, напісанне тэксту па пачатку і інш.).

Такім чынам, навучанне будзе творчым тады, калі педагагічнае майстэрства выкладчыка стане ўзорам для творчасці студэнтаў. Галоўная задача педагога – арганізаваць адносіны з навучэнцамі як творчы працэс, як дыялог, не падаўляючы іх ініцыятыву і вынаходлівасць, ствараючы ўмовы для поўнага творчага самавыяўлення і самарэалізацыі. Для стымулявання творчай працы ў студэнцкім асяроддзі абавязкова трэба замацоўваць матэрыяльныя вынікі творчых пошукаў студэнтаў у тэматычных выставах, выкарыстоўваць іх у вучэбным і выхаваўчым працэсе, канферэнцыях. Як правіла, выканаўцаў лепшых творчых прац прадстаўляюць да ўзнагароджання пахвальнымі лістамі, падзякамі, грашовымі прэміямі, якія ўручаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы. На ўсіх этапах навучання выкладчык павінен не проста дэклараваць сваю павагу да асобы студэнта, але і рэальна адчуваць, перажываць ні з чым непараўнальную каштоўнасць кожнага чалавека ў яго творчым самавыяўленні.

## Літаратура

1. Педагогика и психология высшей школы: Учеб. пособие. – Ростов н/Д.: Феникс, 2002. – 544 с.

2. Сластенин В. А. и др. Педагогика: Учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / В. А. Сластенин, И. Ф. Исаев, Е. Н. Шиянов; Под ред. В. А. Сластенина. – М.: Издательский центр «Академия», 2002. – 576 с.

3. Смирнов С. Д. Педагогика и психология высшего образования: от деятельности к личности: Учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений. – М.: Издательский центр «Академия», 2001. – 304 с.